**А. І. Дубавец,** *выкладчык кафедры беларускай народна-песеннай творчасці*

# РЭЙТЫНГАВАЯ СІСТЭМА НА КАФЕДРЫ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНА-ПЕСЕННАЙ ТВОРЧАСЦІ

У апошні час складаецца новая канцэпцыя адукацыі. На змену прынцыпу «вучыць» прыходзіць прынцып «вучыцца», у якім вялікую ролю адыгрывае самастойная работа студэнтаў.

Мэта вучэбнага працэсу заключаецца не толькі ў перадачы ведаў і навыкаў ад выкладчыка студэнту, але і ва ўсебаковым развіцці ў студэнтаў здольнасці да бесперапыннай самаадукацыі, да творчага ўвасаблення ведаў на практыцы.

Студэнт павінен быць актыўнай фігурай навучальнага працэсу, а не пасіўным аб'ектам навучання. Важным сродкам у дасягненні гэтай мэты з'яўляецца, па-першае, рэгулярная праца студэнтаў на працягу ўсяго семестра, па-другое, сістэматычны кантроль атрыманых ведаў.

Мэта рэйтынгавай сістэмы – прапанаваць тэхналагічныя прынцыпы, якія дапамогуць стымуляваць навучальна-пазнавальную дзейнасць студэнтаў, павысіць якасць ведаў і прафесійнай падрыхтоўкі, максімальна зацікавіць у атрыманні адукацыі ўніверсітэцкага тыпу. Студэнт павінен ведаць, як і па якіх крытэрыях яго атэстоўваюць. Механізм атэстацыі працы просты: за канкрэтна выкананую ці прадэманстраваную работу ён атрымлівае ацэнку ў балах. Рэйтынгавая сістэма прадугледжвае вызначэнне ўдзельнай вагі кожнага віду студэнцкай работы. Наладжваецца партнёрскае супрацоўніцтва паміж выкладчыкам і студэнтам, гэта таксама ліквідуе праяўленні суб'ектывізму, псіхалагічнага дыскамфорту, гарманізуе адносіны паміж выкладчыкам і студэнтам.

Модульная тэхналогія дазваляе адаптаваць навучальны працэс да індывідуальных здольнасцей студэнта. Модуль – гэта мэтавы функцыянальны вузел, у які аб'яднаны навучальны змест і тэхналогія авалодання ім. Модульная тэхналогія дазваляе адаптаваць навучальны працэс да індывідуальных здольнасцей студэнта.

Навучальны курс па індывідуальных і практычных занятках і сістэма кантролю за работай студэнтаў па спецыяльных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дысцыплінах на кафедры беларускай народна-песеннай творчасці падзяляецца на пяць модуляў.

Модулі могуць быць па наступных тэмах:

1. Засваенне і ўдасканальванне тэхнічных і выканальніцкіх навыкаў і ўменняў у працэсе навучання: а) авалоданне тэхнічнымі навыкамі па вывучаемай дысцыпліне; б) удасканальванне выканальніцкага майстэрства; в) набыццё практычных навыкаў канцэртна-выканальніцкай дзейнасці.

2. Самастойная работа ў засваенні вучэбнага матэрыялу: а) самастойны разбор вучэбнага матэрыялу; б) самастойная работа па выпраўленні памылак; в) самастойная работа па замацаванні вучэбных заданняў.

3. Асэнсаванне і авалоданне прыёмамі і метадамі працэсу практычнай работы. Сюды ўваходзіць уменне карыстацца тэарэтычнымі ведамі ў практычнай рабоце.

4. Стаўленне да заняткаў: а) наведванне заняткаў; б) пропускі заняткаў; в) падрыхтаванасць да заняткаў.

5. Падрыхтоўка да прафесійнай дзейнасці: а) асабісты ўдзел у конкурсах і канцэртах; б) наведванне заняткаў па вывучаемых дысцыплінах іншых выкладчыкаў і іншых калектываў; в) праслухоўванне кампакт-дыскаў народных і фальклорных калектываў, вывучэнне дадатковай метадычнай літаратуры.

Кожны з модуляў максімальна ацэньваецца 20 баламі, у выніку атрымліваецца 100 балаў.

Рэйтынгавая сістэма на кафедры беларускай народна-песеннай творчасці прадугледжвае таксама і кантроль выканання заданняў па модулях, тэрмін іх выканання.

– Журнал уліку на працягу ўсяго семестра; кожныя 2 тыдні запіс з наступным абмяркоўваннем (модуль № 5).

– Тэхнічны або акадэмічны залік па вывучаемых дысцыплінах у сярэдзіне семестра (модуль № 1).

– Выкананне кантрольных заданняў па дысцыплінах (ігра партытуры, спеў харавых партый, сольных песен, заданняў па аранжыроўцы і харэаграфіі). Адбываецца на 5–6 занятку (модуль №2).

– Вядзенне дзённіка рэпетыцыйнай работы. Кантроль за выкананнем у канцы семестра на старэйшых курсах (модуль №3).

– Улік балаў за модуль №5 вядзецца на працягу ўсяго семестра.

Для больш выразнага ўсведамлення рэйтынгавай сістэмы на кафедры беларускай народна-песеннай творчасці мы прывядзем у якасці прыкладу дысцыпліну «Дырыжыраванне».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дырыжыраванне – дысцыпліна комплексная, яна канцэнтруе некалькі відаў музычнай дзейнасці: выканаўчы (дырыжыраванне, вакал, ігра на інструменце); аналітычны (уменне аналізаваць партытуру, узровень яе ўспрымання); практычны (методыка працы над творам, прыёмы паказу голасам, на інструменце, здольнасць фармуляваць думку); метадычны (свядомае ўспрымання метадычных установак выкладчыка).

Галоўную ролю ў засваенні метадаў і навыкаў адыгрывае самастойная хатняя работа. У працэсе хатняй падрыхтоўкі фарміруецца перадрэпетыцыйная тэхніка хормайстра, якая ў будучай самастойнай дзейнасці стане падмуркам бесперапыннага прафесійнага росту.

Навучанне па дысцыпліне «Дырыжыраванне» мае індывідуальны характар і патрабуе выявдзення агульнай адзнакі падрыхтаванасці за вызначаны перыяд заняткаў. Веды, атрыманыя па дырыжыраванні, маюць практычны кірунак, залежаць ад методыкі выкладання канкрэтнага выкладчыка і могуць выяўляцца толькі праз уменні і навыкі, прадэманстраваныя ў ходзе кантрольных заняткаў (залік, кантрольны ўрок, экзамен і інш.).

Важным элементам у стымуляванні самастойнай вучэбнай і вучэбна-даследчай работы студэнта з'яўляецца паэтапная ацэнка ведаў. Можна ўвесці больш высокую адзнаку за выкананне творчага задання, за работу, якая выходзіць за рамкі праграмных патрабаванняў. Гэта стымулюе больш інтэнсіўную работу.

Модульная структура дысцыпліны «Дырыжыраванне» складаецца з агульнадыдактычнай мэты (выхаванне эстэтычна развітога музыканта, падрыхтаванага да вакальна-харавой дзейнасці, працы з калектывам), а таксама з дыдактычных мэт вучэбных модуляў. Усе пяць модуляў узаемадзейнічаюць паміж сабой, кожны наступны модуль з'яўляецца лагічным працягам папярэдняга.

Модульная сістэма ставіць студэнтаў перад неабходнасцю рэгулярнай вучэбнай работы (перш за ўсё самастойнай), павышае зацікаўленасць у яе выніках. Студэнт на першых жа занятках па дырыжыраванні знаёміцца з умовамі модульна-рэйтынгавай сістэмы, якія застаюцца нязменнымі на працягу ўсяго семестра. Яны ўключаюць у сябе агульную колькасць модуляў і кантроль іх зместу; сістэму ацэнкі выканання канкрэтнай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

формы самастойнай работы студэнтаў, парадак правядзення кантрольных залікаў, тэрмін выканання кожнага модуля і сістэму адзнак прамежкавых ведаў, парадак вызвалення студэнтаў ад падагульняючых залікаў ці іспытаў па выніках модульнай сістэмы.

Можна прапанаваць наступныя модулі па дысцыпліне «Дырыжыраванне».

– Работа дырыжора над партытурай: а) засваенне партытуры на інструменце; б) засваенне партытуры ўнутраным слыхам; в) мануальнае засваенне партытуры.

– Засваенне і ўдасканальванне тэхнічных навыкаў і ўменняў у стварэнні мастацкага вобразу: а) засваенне тэхнікі аўфтакта; б) засваенне метрычнай сістэмы тактавання; в) развіццё валявога імпульсу; г) сродкі выразнасці ў дырыжыраванні.

– Аналіз харавых твораў: а) гіторыка-стылістычны аналіз; б) музычна-тэарэтычны аналіз; в) вакальна-харавы аналіз; г) выканаўчы аналіз.

– Падрыхтоўка да прафесійнай дзейнасці: а) наведванне харавых рэпетыцый і канцэртаў; б) наведванне заняткаў па дырыжыраванні і пастаноўцы голасу іншых выкладчыкаў; в) праслухоўванне кампакт-дыскаў народных і фальклорных калектываў, вывучэнне дадатковай метадычнай літаратуры.

– Стаўленне да заняткаў: а) наведванне заняткаў; б) пропускі заняткаў; в) падрыхтаванасць да заняткаў.

Сістэма кантролю выканання заданняў па модулях прадугледжвае журнал уліку, тэхнічныя залікі па дырыжыраванні, калёквіумы, рэферат-анатацыю на харавую партытуру, ігру партытуры на фартэпіяна. У выніку выводзіцца адзнака ведаў студэнта па модулях.

Студэнт, які набраў на працягу семестра 90–100 балаў, аўтаматычна атрымлівае найвышэйшую адзнаку ці залік. Студэнт, які набраў на працягу семестра 70 балаў і вышэй, здае іспыт ці залік і можа прэтэндаваць на добрую адзнаку. Студэнт, які на працягу семестра набраў 60 балаў, дапускаецца да заліку ці экзамену. Студэнт, які на працягу семестра набраў меньш за 60 балаў, не дапускаецца да заліку ці экзамену.

1. *Безбородова, Л. А.* Дирижирование / Л. А. Безбородова. – М. : Флинта, 2000. – 231 с.

2. *Живов, В. Л.* Исполнительский анализ хорового произведения / В. Л. Живов. – М. : Музыка, 1987. – 95 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Мусин, И. А.* Язык дирижерского жеста / И. А. Мусин. – М. : Музыка, 2007. – 232 с.
4. *Сергеенкова, В. В.* Управляемая самостоятельная работа студентов. Модульно-рейтинговая и рейтинговая системы / В. В. Сергеенкова. – Минск : РИВШ, 2005. – 131 с.

**С. В. Зыгмантовіч,**
*загадчык кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# АКТЫЎНЫЯ МЕТАДЫ ПРАКТЫКА-АРЫЕНТАВАНАЙ БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ БІБЛІЯТЭЧНЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Сучасная канцэпцыя развіцця вышэйшай адукацыі арыентуе на абнаўленне прафесійнай адукацыі на кампетэнтнаснай аснове шляхам узмацнення яе практычнай накіраванасці пры захаванні фундаментальнасці [2].

У сістэме вышэйшай адукацыі існуе некалькі падыходаў да практыка-арыентаванай адукацыі. Адны аўтары (Ю. Вятроў, Н. Клушына) звязваюць яе з арганізацыяй вучэбнай, вытворчай і пераддыпломнай практыкі студэнта. Іншыя (П. Абразцоў, Т. Дзмітрыенка) неабходнасць яе ўкаранення бачаць у фарміраванні значных для будучай прафесійнай дзейнасці якасцей асобы, а таксама ведаў, уменняў і навыкаў, неабходных у практычнай прафесійнай дзейнасці. Некаторыя аўтары (А. Вярбіцкі, Я. Плотнікава, В. Шаршнева і інш.) станаўленне практыка-арыентаванай адукацыі звязваюць з выкарыстаннем магчымасцей кантэкстнага (прафесійна накіраванага) вывучэння профільных і няпрофільных дысцыплін. Ф. Г. Ялалаў лічыць, што для пабудовы практыка-арыентаванай адукацыі неабходны новы, дзейнасна-кампетэнтнасны падыход [3]. Неабходна прызнаць, што ўсе названыя падыходы не з’яўляюцца ўзаемавыключальнымі і могуць ляжаць у аснове праектавання і рэалізацыі задач падрыхтоўкі сучасных бібліятэчных спецыялістаў.

Распрацаваныя і прынятыя адукацыйныя стандарты для падрыхтоўкі спецыялістаў па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія», тыпавыя навучальныя планы, а таксама праграмы выкладаемых навучальных дысцыплін пабудаваны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ